ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 111 (1070) | ЧАЦЬВЕР, 15-га мая 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Памятка юнкору

Рэдакцыя чакае матар'ялы па наступных пытаньнях:

1. Аб становішчы выкананьня прамфінпляну на другое паўгодзьдзе.
2. Аб цякучасьці рабочай сілы на прадпрыемствах.
3. Аб падрыхтоўцы да набору ў ФЗВ.
4. Аб організацыі адпачынку рабочай моладзі.
5. Аб правядзеньні месячніку „Чырвонай Зьмены".

Масавы аддзел „Чырвонай Зьмены".

ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

ЗА ПАДРЫХТОЎКУ ПРОЛЕТАРСКІХ КАДРАЎ

Тэмпы падрыхтоўкі тэхнічных і кваліфікаваных кадраў адстаюць ад тэмпаў соцбудаўніцтва

(З дакладу намесьніка старшыні Дзяржпляну БССР т. Гольдштэйна)

На вячэрнім пасяджаньні 12-га мая з дакладам аб падрыхтоўцы кадраў выступіў нам. старшыні Дзяржпляну БССР тав. **Гольдштэйн.** Проблема кадраў,—кажа дакладчык,—зьяўляецца цэнтральнай проблемай на даным этапе, яна зьяўляецца рашаючай проблемай соцыялістычнага будаўніцтва.

ВЫКАНАЕМ ПЯЦІГОДКУ У ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Зараз высунут лёзунг аб выкананьні пяцігодкі ў чатыры гады. На шэрагу галін нашай прамысловасьці пяцігадовы плян магчыма выканаць ня толькі ў 4 гады, але і ў 3 гады. Напрыклад, плян па электротэхнічнай прамысловасьці. Пяцігадовы плян па сельска-гаспадарчаму машынабудаўніцтву мы таксама выканаем на чацьвёрты год пяцігодкі. Мы значна перавыканаем меркаваньні 5-гадовага пляну па такіх рашаючых галінах прамысловасьці, як чыгун, нафта, вугаль.

У галіне колектывізацыі мы таксама дасягнулі вялізарных посьпехаў. Напрыклад, па БССР замест 11,6 проц., якія былі намечаны для колектывізацыі ў гэтым годзе і 18 проц. па пяцігодцы на апошні год, мы колектывізавалі ўжо на вясну гэтага году 14 проц. гаспадарак і 18 проц. плошчы.

Што датычыцца прамысловасьці БССР, дык у 1929-30 гаспадарчым годзе мы выканаем па аб'ему тое, што меркавалася выканаць за 1930-31 год, а па кантрольных лічбах на 1930-31 год мяркуецца аб'ём прадукцыі больш як на 1932-33 год па пяцігодцы.

Ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы нам неабходна мець на ўсёй лініі зьверху да нізу сваіх пролетарскіх спэцыялістых.

Правыя не разумеюць, альбо не хочуць разумець проблемы кадраў, яны ня хочуць ня могуць разумець таму, што яны супроць гэткіх тэмпаў індустрыялізацыі супроць гэткіх тэмпаў колектывізацыі, таму, што яны не жадаюць бачыць абвостраньня клясавай барацьбы.

Якія тыпы спэцыялістых нам патрэбны?

Папершае—спэцыялістыя павінны мець шырокі грамадзка-палітычны дагляд і быць шчыльна клясава-вытрыманым і, падругое,—спэцыялісты павінен добра ведаць сваю справу. Пункт погляду аб тыпе нашых спэцыялістых дастаткова формуляваўся ў пастановах партыі.. „Гэтыя кадры павінны ўладаць дастаткова глыбокімі спэцыяльна-тэхнічнымі і эканамічнымі ведамі, шырокім грамадзка-палітычным даглядам, неабходным для організатараў і творчай актыўнасьці шырокіх працоўных мас".

Вось асноўная ўстаноўка ў адносінах тыпу нашых спэцыялістых.

Другі бок справы—гэта пытаньне адносна больш рэзкай спэцыялізацыі. Сама спэцыялізацыя павінна быць больш вузкаю ў тым сэнсе, каб спэцыялісты быў добра знаёмы з самым неабходным па сваёй спэцыяльнасьці, галоўным чынам шляхам азнаямленьня на практыцы.

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ ПРОЛЕТАРСКІМ АСЯРОДКАМ

Як трэба рыхтаваць кадры?

Калі перайсьці да мэтадаў падрыхтоўкі кадраў, дык я думаю, што ў гэтых адносінах мы маем зусім ясную лінію. Мы маем раней за ўсё пытаньне клясавага адбору і вось, у гэтым клясавым адборы, мы сустрэнемся з цэлым шэрагам фактычных цяжкасьцяй.

У 1930-31 годзе ў нас намечан вялікі набор у навучальныя ўстановы, дзе рабочыя павінны заняць самы вялікі процант. Так, у індустрыяльныя навучальныя ўстановы мы павінны прыняць рабочых і іх дзяцей ня меньш 70 проц., на рабфакі—90 проц. Гэтыя проценты забясьпечаньня рабочым ядром навучальных установ павінны быць выкананы. Зараз намі пераводзіцца на бесьперапынны год, бесьперапынны тыдзень цэлы шэраг навучальных установ. Гэта дасьць колёсальную эканомію ва ўсіх выглядах. У навучальных установах уводзіцца бесьперапынная практыка, гэта значыць, что частка вучобы будзе праходзіць ня ў сьценах навучальнай установы, а на самай практыцы. Акрамя таго, мы намячаем прыем і выпуск два разы ў год. Мы таксама ўводзім актыўны мэтад навучаньня—лябараторны мэтад і, нарэшце, памяншаем тэрмін навучаньня.

Мы моцна адстаем у падрыхтоўцы кадраў для народнай гаспадаркі, але мы павінны дагнаць.

Якім чынам мы задаволім тую патрэбнасьць БССР у спэцыялістых, якая выражаецца ў канцы пяцігодкі ў 12 тыс. чалавек вышэйшай кваліфікацыі і 25 тыс. сярэдняй кваліфікацыі, ня лічачы мэдыкаў, пэдагогаў, навукова-дасьледчых работнікаў, асьпірантуры і г. д.

Трэба сказаць, што ў адносінах вышэйшай тэхнічнай адукацыі мы ў БССР моцна спазьніліся. Толькі ў гэтым годзе адкрываецца Політэхнічны інстытут, значыцца атрымаць прадукцыю ў бліжэйшыя гады ад нашых ВТНУ можна будзе ў абмежаванай колькасьці.

Нам патрэбен і другі мэтад падрыхтоўкі спэцыялістых.

Пленум ЦК партыі паказаў, што трэба рыхтаваць тэхнічныя кадры з практыкаў, а таксама з рабочых, якія маюць солідны стаж. Мяркуецца падрыхтаваць людзей з кваліфікацыяй інжынэраў на працягу 1-2 год у колькасьці 200 чалавек. Яшчэ каля 200 чалавек можна атрымаць з нашага ВТУЗ'у. Да гэтай колькасьці зводзіцца ўся падрыхтоўка інжынэраў у межах БССР, у той час, як нам патрабуецца каля 4000 чалавек.

Толькі ў наступную пяцігодку мы зможам насычаць нашу прамысловасьць інжынэрамі, падрыхтаванымі ў БССР. Зараз-жа зможам падрыхтаваць толькі 14 проц. для нашай патрэбнасьці. Што датычыцца тэхнікаў, дык на працягу 4-х год мы выпусьцім каля 4300 ч., гэта—65 проц. нашай патрэбнасьці ў тэхніках будзе намі задаволена. У бягучым годзе мы адчыняем 7 тэхнікумаў, але гэта яшчэ мала. Нам прыдзецца організаваць яшчэ вячэрнія тэхнікумы, якія на сёньняшні дзень слаба разгорнуты. Што датычыцца сельскай гаспадаркі, дык тут справа абстаіць троху лепш. Колькасьць прыёму ў Сельска-Гаспадарчую Акадэмію ў 1930-31 годзе даводзім да 1420 ч.

Колькасьць сельска-гаспадарчых тэхнікумаў у наступным годзе будзе раўняцца 13. Наогул нам удасца забясьпечыць сельскую гаспадарку на 45 проц. кадрамі з вышэйшай адукацыяй і на 55-60 проц. з сярэдняй.

Асабліва востра абстаіць пытаньне з кадрамі для кадраў. Нам прыдзецца адбіраць пэўныя кадры, прапусьціць праз асьпірантуру—2-х гадовую для падрыхтоўкі да навуковай і навукова-дасьледчай работы. Самае цяжкае ў гэтым годзе, гэта тое, што мы павінны прыняць каля 4,5—5 тыс. чал., лічачы вышэйшыя навуковыя ўстановы. У тэхнікумы прыдзецца прыняць 9 тыс. чал., на розныя курсы і фабзавучы каля 7 т. чал., усяго—звыш 20 тыс. ч., а сталая сетка навучальных устаноў і ў тым ліку і 7 годка дае толькі 17 тыс. чал., ня лічачы значнага адсеву па соцыяльнаму складу. Значыцца нам трэба прыбегчы да організацыі курсаў і такім чынам мы ледзь-ледзь забясьпечым прыём. Другая цяжкасьць—гэта ў разьмяшчэньні вучняў. Гэта займае адно з галоўных месц у справе падрыхтоўкі кадраў.

ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ПАТРАБУЕ ХУТЧЭЙШАЙ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ

Крыху прыдзецца гаварыць аб падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых. На вялікі жаль, гэтае пытаньне на сёньняшні дзень яшчэ не прапрацавана.

Прыходзіцца па-бальшавіцку заявіць, што гэтае пытаньне ніводным з органаў ня было пастаўлена на належную вышыню, нават у парадку падрыхтоўкі у межах старай пяцігодкі. Для таго, каб ажыцьвіць вызначаемыя тэмпы па прамысловасьці, ВСНГ патрабуецца, па маёй думцы, каля 125-135 тыс. рабочых к канцу пяцігодкі.

Я-б жадаў падзяліцца данымі адносна складу нашых фабрычна-заводскіх рабочых, адносна іх кваліфікацыі. Аказваецца, што высока-кваліфікаваных рабочых па ўсёй нашай цэнзавай прамысловасьці маецца толькі 4,8 проц., проста кваліфікаваных—17 проц., мала кваліфікаваных—33 проц. і некваліфікаваных—35 проц.

Таварышы, у самым пачатку разгортваньня нашага будаўніцтва была-б памылковым падрыхтоўваць патрэбную вялікую колькасьць кваліфікаваных кадраў праз ФЗВ, калі трэба вучыць некалькі год на базе нашых прадпрыемстваў, у якіх зараз маецца разам з некваліфікаванай часткай усяго 54 т. рабочых ва ўсёй цэнзавай і некалькі больш 40 т. рабочых у прамысловасьці ВСНГБ. Практычна гэта ня выйдзе.

Сёньня маем фабзавуч на базе 4 годкі і прымушаны ўстанавіць тэрмін навучаньня ня меней як 3 гады. Зразумела, мы павінны хутчэй ставіць пытаньне аб пераводзе фабзавучу на базу сямігодкі і абмежаваць курс навучаньня двума гадамі для масавай кваліфікацыі, а для больш высокай трыма гадамі. Зразумела, што грунтаваць ФЗВ трэба на базе 7 годкі. Але ці зможам мы зрабіць гэта зараз, калі сустракаемся з пытаньнем клясавага адбору. Для гэтага мы будзем вымушаны ў гэтым годзе у значнай частцы прыёму ФЗВ базіраваць на 4 годцы. Мы прымушаны, таварышы, прыбегчы да другіх мэтадаў падрыхтоўкі, у тым ліку і да ЦІП'у.

Нам патрэбна 60 т. чал. для будаўніцтва. У будвучах мы гэтай колькасьці ніякім чынам не падрыхтуем. Нам патрэбна будзе зрабіць карэнны пералом у адносінах самага будаўніцтва. Трэба ліквідаваць сэзоннасьць і тагды мы зможам паставіць пытаньне аб значным павялічэньні прапускной здольнасьці праз будвуч, бяз гэтага мы нічога не даб'ёмся і будзем працаваць упустую.

Я лічу, што мы павінны прыбегчы да ўсіх мэтадаў падрыхтоўкі, а менавіта праз ФЗВ, профшколы-профкурсы, брыгады і індывідуальнае вучнёўства, а таксама праз ЦІП.

Напады сялян на фашысцкія організацыі.

ПАРЫЖ, 13. Па паведамленьню газэты „Лібэртэ" з Нэаполю, ў вобласьці Апуліі зрабіліся больш частымі выпадкамі нападу сялян, а таксама насельніцтва невялікіх гарадоў на мясцовыя фашысцкія арганізацыі і гарадзкія ўправы. Непасрэдным повадам хваляваньня служыць няспыннае ўзмацненьне падатковага цяжару. У Марціне Фармака (раён Сорэнто) працоўнае насельніцтва напала на ўправу, выгнала здтуль фашыстых і падпаліла памяшканьне. Выкліканыя ўцёкшымі фашыстымі карабіньеры стралялі ў насельніцтва. Многа раненых. Падрабязнасьці гэтых падзей адсутнічаюць. Фашысцкаму друку забаронена паведамляць аб гэтых і аналёгічных падзеях.

Аблавы „не дапамагаюць"

ТОКІЁ, 13.—Як паведамляюць з Харбіну, ня гледзячы на шырокія аблавы і масавыя арышты, утвораныя 1-га мая ў Мукдэне, мукдэнская ўлада сьцьвярджае, што яны быццам працягваюць атрымліваць ананімныя лісты, у якіх комуністыя заяўляюць, што яны ня спыняць сваю дзейнасьць. Як піша „Дайрэнс Ньюс" арыштаваным у Мукдэне главаром „пагражае кара сьмерці".

Братаньне салдат з рабочымі

ПАРЫЖ, 13-5. „Юманітэ" паведамляе, што ў шэрагу пунктаў Францыі 1-га мая адбывалася братаньне салдат з рабочымі. У Парыжы дэманстраваўшыя перад казармамі рабочыя браталіся з інда-кітайскімі салдатамі.

Пасьля конфэрэнцыі па „разбраеньню"



Будуюцца новыя „залатыя рыбкі"—ваенныя караблі

Паўстанцкі рух у Індыі пашыраецца

У Лёндане выкрыта пагрузка кулямётаў для адпраўкі ў Індыю

ЛЁНДАН, 13. У Паўночна-Заходняй пагранічнай провінцыі Індыі паўстанцкі рух працягвае нарастаць. Армія Хаджы і яго сына рухаецца да Пешавару. У Пешавары распаўсюдзіліся проклямацыі Хаджы.

ЛЁНДАН, 13. У Шалапуры (Індыя) Вараджэсты захапілі кіраўніцтва горадам. Члены конгрэсу занялі муніцыпальныя пасады і організавалі сваю паліцыю. Калі войскі захапілі горад, ваенная ўлада арыштавала паліцэйскіх, назначаных конгрэсам і сарвалі нацыянальны сьцяг, які некалькі дзён разьвіваўся над горадам.

ЛЁНДАН, 13. „Дэйлі Уоркер" паведамляе, што ў лёнданскіх доках рабілася пагрузка кулямётаў для адпраўкі ў Індыю. Пад кіраўніцтвам компартыі адбыўся сход докераў, выкрыўшых пагрузку.

Докеры зьвярнуліся з заклікам да рабочых докаў недапусьціць гэтай пагрузкі.

ЛЁНДАН, 13. Компартыя організавала ў шмат якіх гарадох масавыя дэмонстрацыі бастуючых рабочых шарсьцянай прамысловасьці у знак солідарнасьці з рэволюцыйнымі рабочымі Індыі. Рабочыя пакляліся змагацца за адкліканьне ангельскіх войск з Індыі і супроць адпраўкі новых.

БЭРЛІН, 13. У Бэрліне адбыўся ў сувязі з сэсіяй выканкому 2 Інтэрнацыяналу, якая зараз адбываецца вялікі мітынг. Некалькі індусаў, распаўсюджваўшых сярод удзельнікаў мітынгу лятучкі, напамінаўшыя аб абяцанках 2 Інтэрнацыяналу падтрымаць барацьбу Індыі за незалежнасьць, былі зьбіты атрадам „рэспубліканскага сьцягу", якім кіравалі сац. дэмакраты.

МАРУДНЫЯ ТЭМПЫ ЗРЫВАЮЦЬ ПЛЯНЫ СЯЎБЫ

Колгасы Бабруйшчыны разгортваюць соцыялістычнае спаборніцтва, з посьпехам выконваюць сяўбу

Аднак па шэрагу колгасаў Мазыршчыны і Меншчыны маецца павольнасьць у тэмпах працы па скančэньню вясеньняй сяўбы, зацягваецца выкананьне пасеўных плянаў

Неадкладна перавесьці працу на бальшавіцкія тэмпы работы

Разгорнем падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю

Зараз перад партыйна-комсамольскай організацыяй паўстае новая адказная задача —разгарнуць шырокую масавую працу па падрыхтоўцы да правядзеньня ўборачнай кампаніі.

Зьвесткі з асобных колгасаў („ХУІ партызан" „Чырвоная Зьмена" і інш.), дзе ўжо скончана вясеньняя сяўба, сьведчаць, што на мясцох колгасы і комсамольскія ячэйкі не пераключаюць сваёй працы на падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі, а настроены троху „перадыхнуць".

Задача комсамольскай організацыі—павесьці рашучую барацьбу супроць развважаньняў, „перадышак". Комсамольскія ячэйкі савгасаў, колгасаў і вёсак павінны зараз-жа па скончэньню вясеньняга севу пераключыць сваю працу на падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі. Ячэйкі павінны правесьці працу па пераключэньню ўдарных брыгад з вясеньняй сяўбы на працу па ўборцы ўраджаю і організаваць шэраг новых ударных брыгад.

Уборачная кампанія ўцягне ў працу вялікую колькасьць жаночай сілы, якая ў час вясеньняй пасеў-кампаніі ня была ў такой колькасьці. Комсамольскім ячэйкам неабходна зараз-жа правесьці працу па організацыі ўдарных жаночых брыгад, падрыхтоўцы і вылучэньню з жанчын батрачак, беднячак і серадначак-актывістак, кадраў брыгадзіраў і кіраўнікоў уборкаю для падвышэньня інтэнсыўнасьці працы колгасьніц, у час уборкі трэба організаваць пляцоўкі для дзяцей, і ясьлі і інш.

Побач з падрыхтоўкай кадраў для ўборачнай кампаніі, неабходна зараз-жа распачаць працу падрыхтоўцы сельска-гаспадарчых уборачных машын, іх набыцьцю і рамонту. Комсамольскія ячэйкі савгасаў, калгасаў, вёсак і атрады „Лёгкай Кавалерыі" павінны праверыць становішча ўборачных машын і прыняць належныя меры да іх рамонту і прывядзеньня ў належны выгляд. Вытворчыя-ж ячэйкі павінны прыняць неабходныя меры да забясьпечаньня сканчэньня у тэрмін і раней тэрміну прамфінпляну па вырабу ўборачных машын.

Кампанія ўборкі ўраджаю ў гэтым годзе будзе праводзіцца ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Патрэбна організаваць працу так, каб і тут паказаць пераважнасьць колектыўнай гаспадаркі, даць больш высокую продукцыйнасьць працы, організаванасьць.

Адначасова патрэбна памятаць, што клясавы вораг не пакіне і тут фактаў тэрорызаваньня колгасаў і ўборачная кампанія зьяўляецца самай небясьпечнай. Мы мелі ў мінулым шэраг фактаў падпалу кулаччом, колгаснага збожжа. Комсамольскія ячэйкі колгасу павінны улічыць гэта і зараз разгарнуць працу па забясьпечаньню колгасу належным памяшканьнем для хаваньня збожжа, іх абсталяваньне і ахову ад пажарнай небясьпекі...

Улічваючы памылкі і перагібы ў працы па вясеньняй пасеўнай кампаніі, комсамольскія ячэйкі павінны недапусьціць іх паўтарэньня ва ўборачную кампанію. Праца па ўборцы павінны праходзіць пры разгорнутым соцыялістычным спаборніцтве і ўдарніцкім руху. Комсамольскія ячэйкі павінны дабіцца, каб у час уборачнай кампаніі ня было ніводнага колгасу і савгасу без дагавораў аб соцыялістычным спаборніцтве і ўдарніцкіх брыгад, уцягнуўшы ў іх працу ня толькі комсамольцаў і моладзь, але і дарослых колгасьнікаў.

Адначасова нельга ўпусьціць з-пад увагі ў час уборачнай кампаніі і індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. Комсамольскія ячэйкі павінны організаваць сваю працу так, каб дапамагчы ў працы колгасам і організаваць колгасы на дапамогу ў правядзеньні ўборкі ўраджаю па індывідуальным сэктары.

Толькі пераключыўшы працу комсамольскіх ячэек і колгасаў, адразу пасьля сканчэньня вясеньняга севу мы зможам у дастатковай меры падрыхтавацца да правядзеньня ўборачнай кампаніі і правесьці яе з належным посьпехам.

Пачынаючы з гэтага артыкулу, „Чырвоная Зьмена будзе сыстэматычна на сваіх старонках асьвятляць працу па падрыхтоўцы ўборкі ўраджаю.

КОЛГАСЫ БАБРУЙШЧЫНЫ ШЫРОКА РАЗГОРТВАЮЦЬ СОЦСПАБОРНІЦТВА

Колгасы Бабруйшчыны шырока разгарнулі соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Сяўба ў паасобных калгасах канчаецца. Колгас „Уладзімераўка" абвясьціў сябе ўдарным і выклікаў на соцспаборніцтва колгас „Чырвоны Прамень", паставіўшы перад сабою задачу скончыць да 20-га мая сяўбу, павялічыць пасеў-плошчу на 14 проц., закласьці колектыўны гарод і ўцягнуць у колгас усю беднату і серадняцтва вёскі.

Колгас імя газэты „Комуністы" засеяў 63 га аўсу, 16 га ячменю, 35 бульбы, 30 вікі, 10 га караньплодаў на насеньне, 5 га гародніны і 11 лубіну. Колгас узяў шэфства над вёскай Добысна, дзе працуе колгасная кузьня па рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Па калгасах Асіповіцкага раёну плян пасеўкампаніі выканан па засеву яравога жыта на 90 проц. Добра выконваюцца пляны і па астатніх культурах. Як вынік пасьпяховай працы па сяўбе, у ко[...] гас кожны дзень уступа[...] новыя і новыя бядняцка-[се]радняцкія гаспадаркі.

У колгасе «Бальшаві[к]» Стара-Дароскага раёну, [ра]бочая сіла організована [у] брыгадах. Для аплаты пр[ацы] ўстанавілі пяціразрадную [та]рыфную сетку. Колгас „Р[...]" Горкаўскага сельсавету з [по]сьпехам закончыў сяўбу.

Комсамольскія ячэйкі [ва] ўсіх колгасах прымаюць [ак]тыўны ўдзел у працы: [раз]гортваюць соцыялісты[чнае] спаборніцтва і ўдарніцкі [рух], уцягваючы ня толькі ко[мса]мольцаў і моладзь, але і [да]рослых колгасьнікаў.

Шэраг колгасаў акругі п[ера]ключылі сваю працу на д[апа]могу пасьпяховаму пр[авя]дзеньню сяўбы ў індывіду[аль]ных бядняцка-серадняцкіх [гас]падарках.

Колгасы Бабруйшчыны [...] распачалі паход па орган[іза]цыі працы сілосаваньня [...]моў.

Ш. М—к[...]

Адсутнасьць працоўнай дысцыпліны ў колг[асе] „Бальшавік" зрывае працу

Колгас „Бальшавік" Лагойскага раёну аб'ядняе 103 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, якія разьмеркаваны па 5-ці аддзяленьнях. Гэты колгас мае вялікія пэрспэктывы ў сваім гаспадарчым разьвіцьці, з колгасам мяжуюцца 10 гэктараў фруктовага саду, млын, два цагельныя заводы, вапняны завод і г. д.

Але, ня гледзячы на гэта, у колгасе назіраецца цэлы шэраг ненормальнасьцяй, непасьпяховае выкананьне плянаў вясеньняй сяўбы, а мясцамі і зрыў яе. Усё гэта—вынікі адсутнасьці працоўнай дысцыпліны.

Асобныя аддзяленьні (Зялёны луг), дзе дысцыпліна пастаўлена лепш, ужо амаль скончылі вясеньнюю сяўбу, а ў цэнтральным аддзяленьні і да гэтага часу нічога не засеена таму, што сярод колгасьнікаў няма ніякай працдысцыпліны. Колгасьнікі выходзяць на працу з спазьненьнем на 3-4 гадзіны. Адпрацаваўшы 2-3 гадзіны, ідуць дамоў на адпачынак. Наогул, працуюць так, як не для сябе.

Савет колгасу, комсамольская і партыйная ячэйкі не заняліся пытаньнем упарадкаваньня працы і барацьбы за працоўную дысцыпліну.

У колгасе з-за адсутнасьці вучоту правільнага разьмеркаваньня працоўнай сілы, вывозіўшыя гной, фурманкі стаялі доўгі час у чарзе. Праўленьнем ня прыняты захады, каб перакінуць больш працоўных адзінак, ад чаго цягавая сіла была-б больш [ра]цыянальна скарыстана, ня стоя[ла ў] чарзе.

Да кіраўніцтва колгасаў ня [пры]цягнуты масы колгасьнікаў. Вы[твор]чыя нарады ў колгасе ня склікаюцца, асобныя мерапрыемствы не абг[авар]ваюцца. Гэта перашкаджае пр[ыцягн]уць усю грамадзкасьць да пр[...]нага ўдзелу ў працы і барацьбе [за ...]бамі.

Пытаньнем соцыялістычнага спа[бор]ніцтва і ўдарніцкага руху ў ко[лгасе] ніхто не займаецца.

Райколгассаюз, які знаходзіцца [тут]жа—побач з колгасам, на стано[вішча] працы колгасу не зварочвае [ўвагі], ня кіруе яго працай, як відаць [...] дзяецца на яе самацёк.

Зараз, калі комсамольскія орга[нізa]цыі абвясьцілі паход за організ[ацыю] працы ў колгасах, неабходна Л[агой]скай ячэйцы намеціць шэраг [мера]прыемстваў аздараўленьня стано[вішча] колгасу і дапамогі яму ў выкан[аньні] плянаў вясеньняй сяўбы, паста[віўшы] першачарговай задачай сваёй [пра]цы разгортваньне барацьбы за ўзьн[ят]ьне працоўнай дысцыпліны сярод ко[мса]мольцаў, моладзі колгасьнікаў і [раз]гортваньне соцыялістычнага спа[борн]іцтва і ўдарніцкага руху сярод [бры]гад і асабліва аддзяленьняў, пак[азва]ючы на конкрэтных прыкладах [леп]шыя ўзоры працы.

Расьн[...]

Злачынна не выпраўляюць прарываў

«Чырвоная Зьмена» ужо пісала на сваіх старонках, што ў індывідуальным сэктары Заслаўскага раёну да вясеньняй сяўбы не падрыхтаваны. Сёньня мы яшчэ раз сыгналізуем, што ў паасобных мясцох (Гатаўскі сельсавет) пасеўная кампанія ў індывідуальным сэктары зрываецца. Па шэрагу бядняцкіх гаспадарак не хапае насеньня, а якое маецца—не ачышчана. Сельска-гаспадарчы інвэнтар не адрамантаваны, ды яго і мала. Гэта зрывае выкананьне плянаў сяўбы ў індывідуальным сэктары.

Працы па пашырэньню засеву яравога кліну і правядзеньню агро і зоо-мінімуму па індывідуальным сэктары не праводзіцца. Кампанія ў індывідуальным сэктары падпарадкавана самацеку.

Комсамольскія ячэйкі да гэтага часу ня ўлічылі сыгналу аб пагрозе зрыву і не пераключылі сваёй працы на ліквідацыю прарываў у падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы. Цікава, колькі патрэбна яшчэ сыгналаў для Заслаўскага кіраўніцтва?

Л.

„Деловые" людзі



За паперамі праваронілі падрыхтоўку да сяўбы

Чэрвеньцы зрываюць пляны сяўбы

Сяўба на Чэрвеньшчыне праходзіць надта марудна. Шэраг колгасаў не забясьпечаны ў дастатку цягавою сілай і сельска-гаспадарчым інвэнтаром. Яшчэ горш абстаіць справа з сяўбой па індывідуальным сэктары.

Шмат дзе індывідуальнаму сэктару не адведзен пасеўны клін і асобныя гаспадаркі не ведаюць дзе ім прыдзецца праводзіць сяўбу. Сеў не пачынаўся, а з боку райвыканкому і сельсавету ня прынята тэрміновых мер да ліквідацыі пагрозы зрыву пасеўнай кампаніі па індывідуальным сэктару.

Побач з гэтым трэба констатаваць, што ні Райколгассаюз, ні КТСУ ня прынялі належных мер забясьпечаньня індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак насеньнем. Ёсьць пагроза скарочэньня пасеўнай плошчы.

Контрактацыя зярнавых культур зрываецца, бо сельсаветы не правялі і не праводзяць належнай працы па контрактацыі, і зусім нічога ня робяць па растлумачэньню новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку і ільготах, якія даюцца за пашырэньне пасеў-плошчы і правядзеньне агро і зоо-мінімуму.

Ракіта.

ЗЬНІЗІЛІ ТЭМПЫ ПРАЦЫ

Колгас «Чырвоны Партызан» (Лельчыцкі раён) да вясеньняга севу ўпарта рыхтаваўся яшчэ з зімы. Усё насеньне было абагулена, ачышчана, авёс абменен на гатунковы. Патрэбны сельска-гаспадарчы інвэнтар абагулілі і адрамантавалі. Склалі вытворча-працоўныя пляны і падрыхтавалі патрэбную колькасьць матар'ялу для пратручваньня насеньня. Спачатку ўсё было організавана і колгасьнікі працавалі з вялікай заахвочанасьцю. Але трэба адзначыць, што кіраўніцтва колгасу адразу ўзялося было за працу ўпарта, а цяпер зьнізіла ўвагу да працы.

У колгасе ня выпрацавана правіл унутранага распарадку. У час сяўбы ня ўсё колгасьнікі разьмеркаваны па брыгадах, ня ведаюць дзе і што рабіць.

Зусім няма працы па пераводу колгасу на зьдзельную аплату, нераспрацаваны нормы выпрацоўкі. Колгасьнікі ня ведаюць як будзе праводзіцца аплата іх працы. Гэта ўносіць паміж колгасьнікаў асобныя хістаньні і падзеньне інтэнсыўнасьці ў продукцыйнасьці працы.

Сярод беднаты і батрацтва ў колгасе праца зусім не вядзецца. Організаваная група беднаты і батрацтва не працуе. Батракі, якія ўступілі ў колгас, ня маючы сваіх сродкаў спажываньня, зараз знаходзяцца ў кепскім матар'яльным становішчы. Савет колгасу ня прымае ніякіх захадаў да палепшаньня становішча і забясьпечаньня харчаваньнем.

У працы колгасу комсамольская ячэйка ня прымае амаль ніякага ўдзелу. Комсамольцы цягнуцца ў хвасьце.

Ячэйка не вядзе барацьбы за падняцьце працоўнай дысцыпліны і мерапрыемстваў па ажыўленьню працы сярод беднаты.

Колгасьнік.

Дысцыпліна падае, ня выходзяць на пра[цу]

Колгас „Комінтэрн" Крупскага р-ну (Аршаншчына) яшчэ толькі адсеяў пшаніцу, троху ячменю, часткова падрыхтаваў глебу пад пазьнейшыя яравыя культуры. Але за апошні час, замест пасіленьня працы, наглядаецца падзеньне працоўнай дысцыпліны, таго ўздыму, які быў у пачатку вясеньняй сяўбы.

Асобныя колгасьнікі часта ня выходзяць на працу, падае вытворчасьць працы.

Соцыялістычнае спаборніцтв[а і] ўдарніцкі рух у колгасе не пр[аво]дзяцца. Ні комсамольская ячэйк[а, ні] савет колгасу не правялі нал[ежнай] працы сярод колгасьнікаў па [раз]гортваньню і ўцягваньню іх ва ў[дар]ныя брыгады.

Савету колгасу і комсамольс[кай] ячэйцы неабходна прыняць р[аш]чыя меры па падняцьцю пра[цоў]най дысцыпліны ў правядзе[ньні] сяўбы.

Максім Сочн[...]

Пачатую справу давядзеце да канца

Комсамольская ячэйка заводу „Томскага" у Рэчыцы поўнасьцю выпісвае „Чырвоную Зьмену" але-ж да гэтага часу ячэйка не праверыла наколькі яна чытаецца. Масавая работа навакол газэты не разгорнута. Неабходна зараз-жа ра[згар]нуць масавую работу і ахапіць [...] беспартыйную моладзь падпіск[ай на] „Чырвоную Зьмену".

Булкі[...]

Выязная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ у Віцебску

У ПАЛОНЕ ДЗЯЛЯЦТВА

На заводзе „Чырвоны Мэталісты“ распушчана бюро колектыву ЛКСМБ—яно ня было здольна правільна організаваць і кіраваць узросшай актыўнасьцю рабочай моладзі

БЮРОКРАТЫ З ВІЦЕБСКАГА СКУРЗАВОДУ ДАВЯЛІ АДНАГО З ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ДА ЗАМАХУ НА САМАГУБСТВА. КОМСАМОЛІЯ СКУРЗАВОДУ НЯ ЗДОЛЕЛА ЧУЛА РЭАГАВАЦЬ НА ГЭТЫЯ ПРАРЫВЫ

Неадкладна мобілізаваць масы на ўпартую барацьбу з правым ухілам і з аднэй з разнавіднасьцяй яго—дзяляцтвам, якое перашкаджае правільнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі

І, ЯК ВЫНІК,—ЯНЫ РАСПУШЧАНЫ

За апошнія часы ў Віцебску наглядаецца паслабленьне і зрыў работы буйнейшых комсамольскіх колектываў. На асобных прадпрыемствах уплыву комсамольцаў зусім не адчуваецца,—яны самі плятуцца ў хвасьце, страцілі свой сапраўдны комсамольскі твар і аўтарытэт сярод дарослых рабочых, (завод „Чырвоны Мэталісты“).

За красавік м-ц 2-гі райком ЛКСМБ распусьціў два буйных колектывы: колектыў МББ чыгункі і заводу „Чырвоны Мэталісты“. Вядома, што справа ня ў роспуску бюро колектываў, а ў прычынах, давёўшых колектывы да такога становішча. Бясспрэчна, распушчаны тыя колектывы, якія не змаглі стаць на чале сапраўднага кіраўніцтва масамі, правільна орыентаваць комсамольскую масу, мабілізаваць актыўнасьць мас на барацьбу за вытворчасьць, за выкананьне і перавыкананьне прамфінплану.

Гэтыя колектывы адыгрывалі ролю хвасьцістых, ня ішлі ў першых шэрагах барацьбітоў, не вялі ўпартай барацьбы з праявамі правага ўхілу, рвацтвам, разгільдзяйствам, лжэ-ўдарніцтвам і інш. Яны падтрымлівалі гэтым настроям сваёй няўважлівасьцю і нячуткасьцю да сыгналаў зьнізу. Гэта адна з буйнейшых памылак гэтых колектываў, якая паглыбіла і паскорыла іх развал.

Комсамольскі колектыў МББ чыгункі да гэтага часу не прапрацаваў яшчэ пытаньняў нацполітыкі. Трохмесячнік беларускай пролет-культуры сарваўся.

З 270 комсамольцаў у соцспаборніцтве і ўдарніцтве ўдзельнічае толькі 30 чалавек. Праявы антысэмітызму ня зжыты. Калі разглядалася справа аб антысэмітызьме, дык комсамольцы адзначалі: „у нас яўрэяў няма, значыцца няма і антысэмітызму“(?!). Конфэрэнцыя рабочай моладзі таксама была сарвана. З колектыву МББ, дзе маецца 560 чалавек моладзі, на конфэрэнцыі прысутнічала толькі 30 асоб. З колектыву заводу „Чырвоны Мэталісты“ прыбылі толькі адзінкі. Належыць адзначыць малы рост колектыву МББ, які за час ленінскага заклiку вырас усяго на 17 чалавек, з якіх толькі 1 рабочы. Кіраўнікі комсамольскага колектыву адарваліся ад масы.

Парторганізацыя не дапамагае комсамольскаму колектыву. Характэрна, што партколектыў ня ведае, што робіцца ў комсамольскім колектыве. З лістапада месяца мінулага году партколектыў ні разу не зацікавіўся становішчам комсамольскага колектыву, яго жыцьцём і працай.

Пры перавыбарах заўкому заводу „Чырвоны Мэталісты“ ніводзін комсамолец не ўвашоў у яго склад? Аб чым гэта гаворыць? Аб чым гаворыць нам зрыў політсуда, які па сёньнешні дзень яшчэ не адбыўся? На што нам указвае зрыў конфэрэнцыі моладзі? Нарэшце, чым можна растлумачыць занясеньне рабочымі ўсіх комсамольцаў дрэваапрацоўчага цэху на чорную дошку?

Пералічаныя факты з усёй яскравасьцю паказваюць нам, што комсамольская маса заводу не дысцыплінавана, што яна ад комсамольскага жыцьця адарвалася, што комсамольцы забыліся аб тым, што яны зьяўляюцца комсамольцамі. Факты даводзяць, што яны страцілі свой аўтарытэт і слаўнае імя комсамольца. Сярод комсамольцаў пануюць некомсамольскія настроі і абмежаванасьць. Яны кажуць: „няхай працуе той, каму даручана, а мы прычым тут(?)“. Вось такая абмежаванасьць і нядбайныя адносіны да ўсяе комсамольскае работы не даюць магчымасьці добра ахапіць усе галіны комсамольскай працы. Комсамольцы ігноруюць комсамольскую работу, прыкрываюцца вучобай, спэкулюць ёю. Часьцяком ад комсамольцаў можна пачуць такое тлумачэньне прычын адказу ад комсамольскай работы: „я комсамольскай працы выконваць не магу—заняты, нагружайце тых, хто ня вучыцца“.

Бюро комсамольскага колектыву бясьсільна хваталася за ўсё, але нічога не зрабіла, не змагло замацаваць дасягнутага. Так, калі раней ва ўдарных брыгадах было 90 комсамольцаў, дык зараз іх засталося 20-25.

Дырэктыва аб 100-процантным ахопе рабочай моладзі комсамольскімі організацыямі засталася толькі дырэктывай—ня болей. Сэкратары цэхавых комсамольскіх ячэек і колектыў цалкам зьявіліся толькі наглядальнікамі, выканаўцамі тэхнічнай работы, а не кіраўнікамі, якія-б накіравалі ўсю работу па правільным шляху. Колектыў ня змог перабудаваць працы ячэек, ня змог паставіць іх работу на новыя рэйкі, ня змог прыстасавацца да патрабаваньняў масы. Паводзіны комсамольцаў на агульным сходзе комсамольскага колектыву, дзе стаяла пытаньне аб роспуску бюро колектыву, болей чым ясна кажуць нам аб іх „удзеле“ у комсамольскім жыцьці. Яны маўчалі замест жорсткай крытыкі і выкрыцьця хваробных зьявішч, як быццам яны іх зусім не кранал.

Шматлікіх памылак, якія мелі месца ў практычнай рабоце комсамольскага колектыву заводу, члены бюро па-бальшавіцку не прызналі. Яны „ганарова“ заяўлялі:—„мы працавалі добра“. (?) Партыйнае кіраўніцтва ня было мобілізавана на ідэолёгічнае выхаваньне моладзі, бо партколектыў заводакіраўніцтва пад „добрай“ працай разумее прымацаваньне свайго прадстаўніка, які-б наведваў комсамольскія сходы... крышка, больш нічога. Віну за развал комсамольскага колектыву ня ў меншай меры павінна несьці бюро партколектыву, якое добра бачыла такое пагражаючае становішча, але не рэагавала на гэта належным чынам, ня імкнулася нават спыніць далейшы развал, хоць чым-небудзь дапамагчы, што лішні раз паказвае нам наколькі „чула“ адносяцца заводзкія парторганізацыі да работы комсамолу.

Другі раённы камітэт ЛКСМБ не мабілізаваў актыву раёну на выпраўленьне гэтых прарываў, ня вёў праверкі ходу работы колектываў, а самае галоўнае—не прыслухоўваўся да трывожных сыгналаў зьнізу, якія настойліва крычалі аб пагражаючым становішчы вышэйадзначаных колектываў. АК ЛКСМБ, сумесна з парторганізацыямі, павінен безадкладна заняцца вывучэньнем прычын, давёўшых буйнейшыя комсамольскія колектывы да развалу, падрабязна вывучыць карэньні гэтых прычын, каб на падставе вынікаў вывучэньня, усю работу гэтых колектываў паставіць на новыя рэйкі, перабудаваць яе, выходзячы з папярэдніх памылак, і даць магчымасьць ім, з аднолеными сіламі выправіць дапушчаныя памылкі, якія павінны зьявіцца належным вурокам для ўсёй комсамольскай організацыі Віцебшчыны.

ВІТ. СІДАРУК.



Колектывы ЛКСМБ „Чырвоны Мэталіст“ ня бачылі прарываў

І тут—непаладкі

(Налёт на конны двор Віткомтрэсту брыгады юнкораў „Чырвонай Зьмены“)

Роўна а 5 гадзіне раніцы наша брыгада ў складзе 9 чалавек, запасшыся неабходнымі прыладамі: блёк-нотамі і алоўкамі, вышла ў налёт. Па дарозе заходзім за прадстаўніком выязной рэдакцыі нашай газэты „Чырвоная Зьмена“—тав. **Анішчуком**. З намі ідуць старшыня фабкому **Карноўскі** і памочнік загадчыка коннага двара тав. **Кісьлік**.

Падыходзім да коннага двара. У вочы кідаюцца раскінутыя па ўсім двары, дровы, дошкі і розныя прылады.

Разьбіваемся на дзьве часткі і прыступаем да нашай мэты—выяўленьня ўсіх недахопаў, фактаў безгаспадарнасьці і г. д.

Памочнік загадчыка двара—т. **Кісьлік**—дае нам некаторыя тлумачэньні.

— Конны двор контрэсту організаваны 2 месяцы таму назад. Для організацыі двара гарсаветам адпушчана 115 коняй, 53 павозкі. Ня ўсё прыведзена ў парадак.

Заходзім на канюшню. У памяшканьні брудна, коні стаяць у ямах. Дугі, інвэнтар валяецца на падлозе. Большасьць коняй не ачышчаны. Кармушкі ня чыстыя, авёс пыльны і з сьмецьцем. Збруя не замацавана за кожным рабочым, у выніку—няма адказнасьці. Назіраем маленькі факт: коняй поюць з брудных бочак. Коні, якія хварэюць мытам, п'юць з аднэй пасуды з здаровымі, тады як мыт—хвароба заразная. Ідзем далей. Авёс у канюшні знаходзіцца ў дзіравых скрынях. Жалеза для шын ляжыць на двары. Інвэнтар знаходзіцца пад даждждом.

Агнягасільнікі ня ўсе зараджаны. Зусім нядаўна праведзена вада к калодзежам. Пажарная дружына толькі ў стадыі разьвіцьця.

Мясны абоз складаецца з 6 коняй і фур. Бляха на фурах абцёрлася, у фурах—чэрві і бруд.

Рабочыя прапанавалі зрабіць у абозе дошкі і пафарбаваць масьляпай фарбай, але іх не паслухалі. І ў такім анты-санітарным становішчы абозу мяса развозіцца па горадзе.

Культработы ніякай не праводзіцца. Рабочым ніколі не гаварылі аб тым, як патрэбна абыходзіцца з коньмі. Соцспаборніцтва праводзіцца слаба. Перад рабочымі ня ставілася гэтага пытаньня.

Рабочыя па сваёй уласнай ініцыятыве жадалі выклікаць на соцспаборніцтва абоз Белдзяржбуду, але і гэтая ініцыятыва рабочых ня была праведзена.

Для абгаварэньня і падвядзеньня вынікаў налёту, брыгада запрасіла к сабе загадчыка коннага двара **т. Зяльвінскага**. На заўтра наша брыгада сабралася для падвядзеньня вынікаў налёту. Пасьля таго, як брыгадзіры падзяліліся сваімі ўражаньнямі і расказалі аб усіх ненармальнасьцях, якія імі былі выяўлены пры налёце,—**Зяльвінскі** дае некаторыя тлумачэньні:—Наша канюшня зьяўляецца самай узорнай ня толькі ў акрузе, але і ў Беларусі,—так нам сказала камісія з Менску. Канюшня будавалася ў працягу 1 з пал. месяца. З-за адсутнасьці памяшканьня 50 саней-фураў стаяць на вадакачцы. 60 пр- рабочых качагараў прымацаваны да коняй, а астатнія яшчэ не прымацаваны. Наконт таго, што ў памяшканьні, дзе захоўваецца авёс, знойдзена рама з разьбітым шклом, я лічу і прызнаю гэта за факт ненармальны.“—Але тут-жа т. **Зяльвінскі**, ня гледзячы на прызнаньне, пачаў даводзіць, што авёс так ці інакш не папаў-бы коням са шклом, бо шкло заўважылі-б.

Што датычыцца мяснога абозу,—гаворыць брыгадзірам **Зяльвінскі**,—дык гэта тлумачыцца тым, што няма ацынкаванай бляхі. Афарбаваць масьлянай фарбай і пакрыць абоз дрэвам, мы думалі, але знайшлі, што правядзеньне ў жыцьцё гэтай прапановы рабочых немэтазгодна, бо фарба пасьля дажджу змыецца, ды яшчэ па шмат якіх прычынах.

Пры двары будуецца шпіталь для хворых коняй.

Брыгада, абгаварыўшы ўвесь матар'ял налёту, прапанавала адміністрацыі цэлы шэраг конкрэтных мер, якія трэба правесьці для выжыцьця існуючых недахопаў.

Ад імя брыгады—
Эйцінгін Леў.

ДАВЯЛІ ДА САМАГУБСТВА

Нэрвова стукаў варштат. Схіліўшыся каля яго старанна працаваў комсамолец-ударнік т. **Зысэрсон**. Не адрываючы вачэй ён пільна сачыў за працай, выстукваючы штампам нейкі прыемны марш.

Працаваў ён сапраўды па-ударнаму. Па ўстаноўленай мінімальнай норме ён павінен быў выпрацоўваць па 2650 пар заднікаў за рабочы дзень. Гэтая норма здавалася яму невыстарчальнай і ён добраахвотна дабіўся яе павялічэньня да 4 тысяч пар, а часта і гэту правышаў, выпускаючы па 5200 пар. Расцэнкі сабе ён таксама зьнізіў—з кожнай сотні адштампованых заднікаў па 1 капейцы. Па ўстаноўленых расцэнках адштампаваць сотню заднікаў каштавала 7 капеек, а Зысэрсон гэтую працу выконваў за 6 капеек, чым даваў штомесячна 12-15 руб. эканоміі.

Усё было добра. Дні істужкай цягнуліся адзін за другім, штампы і машыны выводзілі сваю звычайную мэлёдыю, сьпявалі маторы...

Інструктар **Барэнбаум** праходзячы аднойчы па цэху зірнуў на згорбленую, зьлітую з варштатам постаць занятага працай чалавека. Яго вочы варожа блiснулі бякамі, ён жалчна прамармытаў сабе пад нос: „Што, ударнік, ручкай стукаць, шкодзіць? Марш на біржу“.

Так пачалося „знаёмства“ **Барэнбаума** з рабочым Зысэрсонам, так пачалося ганебнае цкаваньне комсамольца-ударніка.

Па волі „усемагутнага“ **Барэнбаўма**, Зысэрсона зьнімаюць з працы на варштаце і перакідваюць на чорную працу.

Ён пакорліва, бяз слова супярэчаньня, павінаваўся капрызу і „пастанове“ **Барэнбаўма** і таксама старанна, як і раней, насіў скуры, вугаль і рабіў усё, што загадвалі.

Прапрацаваўшы некаторы час на чорнай працы, **Зысэрсон** зьвярнуўся да загадчыка штамповачнага цэху Шчалкаліна з просьбай паставіць на ранейшую працу, на што атрымаў адказ: „у цябе з **Барэнбаумам** заўсёды недарэчнасьці. На табе пісульку і лепш ідзі на біржу“. Гаварыць з табою болей не хачу. Ты нам непатрэбен“. Усё-ж такі настойлівыя патрабаваньні ўзялі свае. **Зысэрсона** зноў паставілі на штампоўку заднікаў, але стварылі немагчымыя ўмовы для працы. **Барэнбаум** перашоў у адкрытае наступленьне, ён абзываў Зысэрсона рознымі словамі: „сымулянт“, „лодыр“, „шкоднік“, контррэволюцыянэр“ і інш.; стаяў за яго плячыма і крычаў: „хутчэй, працуй. Гэту працу можна за пяць хвілін зрабіць, а ты возішся“!

Усе „гэтыя „спосабы“ давалі мала рэальнага і Барэнбаум рашыў выкінуць чарговы „трук“.

Штампавалі заднікі ўвесь час толькі на дзьвюх зьменах, што забясьпечвала поўную нагрузку, але „знаходлівы“ **Барэнбаум** паставіў перад сабою мэту канчаткова дабіць **Зысэрсона**, які цярпеў, але настойліва змагаўся з ім—цьвёрдалобым адміністратарам.

Папярэднім яго распараджэньнем **Зысэрсон** быў перастаўлен працаваць на трэцюю зьмену. Пасьля гэтага „баявога“ кроку, яго самастойным распараджэньнем штампоўка заднікаў была раздроблена на тры зьмены з такім разьлікам, каб на трэцюю зьмену заставалася для штампоўкі толькі некалькі сот пар, пры норме поўнай нагрузкі 4—5 тыс. пар. Вынік з гэтага ясны: для **Зысэрсона** гэтай нормы хапала на адну гадзіну, а ў некаторых выпадках—на дзьве. Рэшту чаcу ён прымушан быў прастойваць.

Зысэрсон комсамолец-ударнік, разумеючы, што 5-6 гадзінны прастой дае значныя страты заводу, настойліва патрабаваў работы, хоць-бы і не па сваёй спэцыяльнасьці, але натыкаўся на гранітную халоднасьць **Барэнбаума** „Не надаядай мне, як горкая рэдзька. У мяне і без цябе спраў хапае. Выходзь адсюль, табе работы ў мяне няма“.

Няправільныя і яўна шкодніцкія распараджэньні **Барэнбаума** не маглі прайсьці міма вачэй рабочых. Яны пачалі гаварыць, што распыленьне работы па штампоўцы заднікаў на тры зьмены зроблена няправільна, бо поўнай нагрузкі хапае толькі на дзьве зьмены. Але, **Барэнбаум** „ганарова“ заяўляў: „так трэба, я так хацеў“.

Зысэрсон пачаў сыгналізаваць далей, але дырэктар заводу т. **Чыж** і намесьнік яго т. **Хайкін** супакойвалі: Ты ня крычы,—не паднімай шуму. Работа будзе“. Але умовы з кожным днём пагаршаліся.

Зысэрсон ня вытрымаў. У ноч з 9 на 10 мая ў часе працы ён... павесіўся. Але шчасьлівая выпадковасьць не дала захіснуцца маладому жыцьцю—яго ўбачылі і пасьпелі зьняць ў час.

У кішэні сваёй вопраткі ён пакінуў пісульку: **„Прашу прабачэньня за гэты спосаб. Знайсьці праўду цяжка. Іншага выхаду няма“. Зысэрсон“.**

Замах т. Зысэрсона на самагубства—учынак, бясспрэчна, некамсамольскі, учынак упадніка, дэзэртыра з гаспадарчага фронту, які ня здолеў цьвёрда змагацца да канца.

Уся комсамольская грамадзкасьць павінна жорстка асудзіць такі ўчынак комсамольца. Але ня менш жорстка павінна змагацца з тымі бяздушнымі галавацяпамі, якія сваёй чыннасьцю і справамі даводзяць людзей да крайнасьці, да самагубства.

Гэтае здарэньне патрабуе ад нас асаблівай чуласьці, з прычыны таго, што замах т. **Зысэрсона** на самагубства ёсьць другі па ліку выпадак на скурзаводзе. З матар'ялаў відаць, што Зысэрсон нацiскаў на ўсе рычагі, ён трывожна сыгналізаваў на ўсіх дыстанцыях, але фабком, адміністрацыя, комсамольская і партыйныя ячэйкі спакойна „пачывалі на лаўрах“, не рэагавалі належным чынам на чыннасьць гнілых разлажыўшыхся чынуш, не стварылі належных ўмоў для працы камсамольца-ўдарніка т. **Зысэрсона** і сваёй нячуласьцю штурхнулі яго на такі ўчынак.

Мы патрабуем тэрміновага прыцягненьня да судовай адказнасьці тых, хто зьдзекваўся і цкаваў комсамольца ўдарніка т. **Зысэрсона**.

В.

Месячнік „Чырвонай Зьмены"

Тыражная праца—справа кожнага комсамольца

Кожная ячэйка, комітэт, колектыў у часе месячніку павінны шырока разгарнуць працу вакол „Чырвонай Зьмены", завярбаваць як мага больш падпішчыкаў на сваю газэту

Працу ўпаўнаважаных—на новыя рэйкі

У галіне распаўсюджваньня беларускага друку, у прыватнасьці юнацкага, зроблена яшчэ надзвычайна мала. Сучасныя формы работы ў гэтым напрамку значна адстаюць ад тых запатрабаваньняў, якія прад'яўляе пэрыод соцыялістычнага будаўніцтва выхаваньню політычнай сьвядомасьці працоўных мас.

Праца „час ад часу" з „халадком" павярховасьць часта назіраюцца, асабліва ў нізавой сетцы распаўсюджвальнікаў—ячэйкавых упаўнаважаных. Малая ўвага гэтаму важнаму вучастку працы з боку асобных комсамольскіх організацый, разважаньні: „Чаго сьпяшацца,—над намі ня капле" бязумоўна—не маглі даць рэальных вынікаў пасьпяховага прасоўваньня юнацкіх выданьняў у гушчы комсамольскай працоўнай моладзі.

Досыць адзначыць, што па ўсёй організацыі комсамолу Беларусі, якая налічвае ў сваіх шэрагах каля 85 тысяч комсамольцаў, „Чырвоную Зьмену" чытаюць толькі 21 проц. Паогул, усіх юнацкіх выданьняў выпісваюць ня больш 35 тысяч.

Старыя формы распаўсюджаньня, спасыланьне „на авось і абы-як" павінна быць рашуча адхілены, **іх месца павінны заняць норвыя формы, пабудаваныя на сьвядомасьці работы, ударнасьці, глыбокай масавай рабоце з чытачамі, вывучэньні і задавальненьні іх запатрабаваньняў: разуменьне—сярод каго і з кім трэба праводзіць працу—будзе лепшым залогам посьпехаў у галіне тыражнай работы з газэтай.**

У сваёй пастанове на дакладу рэдакцыі „Чырвонай Зьмены", ЦК ЛКСМБ абавязвае ўсе організацыі комсамолу АК, РК і ячэйкі шырока разгарнуць работу па прасоўваньню «Чырвонай Зьмены» у гушчы працоўнай моладзі. Праводзімы зараз месячнік „Ч. З." павінен даць адпаведныя вынікі росту тыражу газэты па ўсіх ячэйках і замацаваньня яго на больш доўгі час праз правядзеньне доўгатэрміновай падпіскі.

Праверкай, наколькі комсамольцы ахоплены падпіскай на газэту, павінны заняцца ня толькі ўпаўнаважаныя, але і ячэйкі ў цэлым. Пытаньня распаўсюджаньня «Чырвонай Зьмены» павінна стаць адной з ударных частак работы комсамольскай ячэйкі.

Соцспаборніцтва паміж ячэйкамі, раёнамі, акругамі, стварэньне ўдарных брыгад па распаўсюджваньню і організацыі масавай працы вакол газэт, вось тыя новыя формы, якія ў асноўным павінны спрыяць выкананьню лёзунгу: „кожны комсамолец —чытач і падпішчык „Чырвонай Зьмены".

Дзянісьсеў.

Л Е Ж А Б О К І

„Лепшыя" раённыя організацыі па невыкананьню кантрольных лічб тыражу газэты „Чырвоная Зьмена"

Назва раёнаў	Акругі	Належыць мець па кантрольных лічбах	Выпісваюць на май м-ц
Камарынскі р-н	Гомельская	150	13
Лоеўскі	„	150	16
Высачанскі	Віцебская	200	25
Старобінскі	Бабруйская	100	34
Парыцкі	„	100	44
Чэрыкаўскі	Магілеўская	200	18
Кармянскі	„	150	30
Хацімскі	„	150	23
Журавіцкі	„	100	36
Дрыбінскі	Аршанская	200	35
Расьнянскі	„	150	37
Вульскі	Полацкая	200	35

Бярэце прыклад з перадавых раёнаў

Лепшыя раённыя організацыі ЛКСМБ па выкананьню кантрольных лічб тыражу газэты „Чырвоная Зьмена"

Назва раёну	Акруга	Належыць мець па кантрольных лічбах	Выпісваюць на май
Рэчыцкі	Гомельская	200	372
Сьмілавіцкі	Менская	200	231
Жыткавіцкі	Мозырская	175	182
Петрыкоўскі	„	100	208
Калінкавіцкі	„	150	234
Нараўлянскі	„	100	116
Мсьціслаўскі	Аршанская	150	252
Слуцак	Бабруйская	350	435
Стара-Дарожскі	„	100	164
Любанскі	„	100	141

Трэцяя фрунзэўская парт-конфэрэнцыя

Выкрываючы прарывы і недахопы—па-бальшавіцку забясьпечым пасьпяховае прасоўваньне да новых перамог

12-га мая—5-ы дзень работы 3-яй Фрунзэўскай парт. конфэрэнцыі. Адчынілася конфэрэнцыя спрэчкамі па дакладу тав. Шпэктарава.

Першым выступіў т. Левін, які застанавіўся на процэсе працы савецкіх ячэек. Ён прывёў шэраг конкрэтных фактаў, як некаторыя савецкія ячэйкі ня справіліся з укладзенымі на іх задачамі. Ён таксама падкрэсьліў слабы ўдзел партыйцаў у чыстцы савецкага апарату і профработы. У канцы т. Левін указаў на тое, што дагавор, які заключылі паміж сабою спэцыялістыя з комсамольцамі фрунзаўкі, нявыкананы.

Тав. Свaскін гаворыць аб працы рабочых брыгад па колектывізацыі. Ён падкрэсьліў слабы ўдзел комсамольцаў у гэтай рабоце. Комсамол і профсаюзы, па прыкладу нашага заводу, як належыць не павярнуліся тварам да вытворчасьці.

Тав. Станкевіч затрымаўся на тым, што часьцяком прамфінплян, гадавыя пляны складаюцца бяз шырокага ўдзелу ў гэтай надзвычайна важнай справе рабочых мас. У сваім слове тав. Станкевіч завострыў увагу конфэрэнцыі на комунальнай справе і пажарнай ахове.

Тав. Усава спынілася на выкананьні прамфінпляну рабочымі ф-кі „Кастрычнік". Яна падрабязна расказвала конфэрэнцыі, як, дзякуючы вялічэзнаму энтузіязму рабочых, ф-ка „Кастрычнік" прамфінплян, які меў правал у першым квартале, на другі квартал выканала з перавышкай. Зараз рабочыя ўзьнялі пытаньне аб павышэньні нормы выпрацоўкі: з 391 паліто—да 420 паліто.

Побач з гэтым, яна спынілася на пытаньні адзінаначальля, тэхнічных няўвязак, працы сярод жанчын і ліквідацыі няпісьменнасьці.

Тав. Брыль адзначыў тыя перагібы і скрыўленьне генэральнай лініі нашай партыі, якія мелі месца ў асобных мясцох пры правядзеньні колектывізацыі. Ён указаў на зробленыя ім самім памылкі ў гэтай галіне, падкрэсьліўшы, што Акругком і ЦК своечасова ўказалі яму на іх. Тав. Брыль таксама затрымаўся і на пытаньні грамадзкага харчаваньня, падкрэсьліў, што зусім мала займаўся гэтым пытаньнем.

Выступіўшы ў спрэчках тав. Чарнякоў, застанавіўся на сучасным становішчы соцыялістычнай перабудовы вёскі. Асабліва чотка па-бальшавіцку ўскрыў і асудзіў свае памылкі і тую шкоду, якую яны маглі прынесьці справе соцыялістычнага будаўніцтва.

Затым выступіў тав. Курцік, які ўказаў на факты праяўленьня нацыянал-дэмократызму, на становішча самакрытыкі ў колектывах рэдакцыі, дзе яна разгорнута нездавальняюча.

З вялікай прамовай аб становішчы колгаснага руху, аб перагібах і скрыўленьнях генэральнай лініі партыі асобнымі работнікамі і асобнымі зьвеньнямі парт-організацыі выступіў сэкратар ЦК КП(б)Б Васілевіч,—які даў падрабязны аналіз усім гэтым пытаньням.

На конфэрэнцыі зрабіў надзвычайны даклад аб міжнародным становішчы намесьнік старшыні РВС СССР тав. Уншліхт.

* * *

Ад імя Кастрычнікаўскай парт. організацыі вітаў конфэрэнцыю тав. Варончанка.

* * *

6-ы дзень працы конфэрэнцыі пачаўся з спрэчак па дакладу РК КП(б)Б. Выступіла—5 чалавек. Пасьля іх тав. Шпэктараў ў сваёй заключнай прамове адказаў на ўсе запытаньні, закранутыя ў спрэчках. Пасьля прыняцьця рэзолюцыі, конфэрэнцыя заслухала даклад мандатнай камісіі і прыступіла да перавыбараў кіруючых райпарт. органаў.

Ц. В.

Пяць год упартае творчае працы

(Да 5-ай гадавіны Амсьціслаўскай студыі БелАПП'у)

Сёньня 15-га мая г. г. спаўняецца пяць год працы Амсьціслаўскай літаратурнай студыі БелАПП'у. Студыя организавалася 15-га мая 1925 году. Прайшло пяць год упартае творчае працы. За гэты параўнаўча малы час студыяй праароблена вялічэзная праца.

З першых-жа дзён Амсьціслаўская студыя пачынае праводзіць сыстэматычную працу, як непасрэдна творчую, так і грамадзкую, культурна-асьветную. Студыя з першых дзён свайго ўтварэньня зьявілася носьбітам культуры ў шырокія працоўныя масы Амсьціслаўшчыны.

З шэрагаў Амсьціслаўскай студыі выйшлі на далягляд беларускай пролетарскай літаратуры такія буйна-сакавітыя маладыя творчыя велічыні, як Юлі Таўбін, Зьмітрок Астапенка, Аркадзь Куляшоў, Ганна Сапрыка і інш. Растуць і самавызначаюцца і такія таленавітыя творчыя адзінкі, як Янка Панамароў, Гоманаў, Сьцяпан Асьціпенка, Зяма Півавараў, Сяргей Калугін, Максімаў, Аўген Сіняков і цэлы шэраг іншых.

Пад кіраўніцтвам студыі працуюць цэлы шэраг літаратурных гурткоў пры сямігодках і другіх навучальных установах Амсьціслаўшчыны, адкуль вылаўліваюцца творчыя таленавітыя сілы на ніву стварэньня пролетарскай культуры.

Адначасова з пятаю гадавінаю існаваньня амсьціслаўскай студыі БелАППу збываецца першая гадавіна заснаваньня пры студыі яўрэйскай літаратурнай сэкцыі, якая на сёньня мае больш 12 творчых асоб, і кіруе яўрэйскі літаратар П... Сэкцыяй выпушчаецца рукапісны часопісь „Эрштэ Трыт" („Першыя крокі"). Адзначаючы пяцігадовы юбілей Амсьціслаўскай літаратурнай студыі БелАПП'у і, пасылаючы ўдзельнікам-літаратарам самае гарачае і шчырае вітаньне, мы жадаем ім яшчэ большых посьпехаў у справе будаўніцтва беларускай пролетарскай культуры шляхам яшчэ шчыльнейшага зьліцьця з комсамолам, шляхам яшчэ большага разгортваньня масава-культурнай працы, шляхам яшчэ шырэйшага паглыбленьня творчай працы, памятаючы, што праца студыі зьяўляецца моцнай падмогай агульнай працы па будаўніцтву соцыялізму і яе посьпехі спрыяюць посьпехам гэтага будаўніцтва.

Ул. Сядура.

Амсьціслаўскай лістудыі БЕЛАПП'у

Сэкратарыят БЕЛАПП'у і рэдакцыя часопісі „Маладняк" вітаюць літстудыю з пяцігодзьдзем яе працы. 5 год працы далі свае вынікі: шэраг таварышоў з літстудыі сваёй творчасьцю ўжо паклалі новыя цагліны ў мур беларускай пролетарскай літаратуры.

Паказаньні літстудыі; ахапіць сваёй працай батрацкую і беднняцкую моладзь і больш сьвядомыя элемэнты серадняцкай моладзі, вывучаць прынцып пролетарскай літаратуры; вывучаць самую тэхніку літаратурнай творчасьці; сур'ёзна, пры ўдумлівай самакрытыцы, удасканальваць сваю творчасьць: рыхтаваць у сваіх шэрагах пад кіраўніцтвам компартыі, пры дапамозе БЕЛАПП'у новыя кадры пролетарскіх пісьменьнікаў, змагароў за гегэмонію пролетарскай літаратуры.

З таварыскім прывітаньнем адказны сэкратар праўленьня БЕЛАПП'у Я. ЛІМАНОЎСКІ.

Адказны сэкратар рэдколегіі „Маладняк" А. ЗВОНАК.

Менск, 14 мая, 1930 г.

Паштовая скрынка

Зяньковічу—„Вецер сум разьвеяў", Каліне—„Родны мой край", Лёшку—„Вуліца", „Агнём мы гарэлі", Шэніману—„Плачуць межы", Вярбалову—„Вербы", Касачу—„На новым разгоне", Зянько В.—„Рыхтуемся", Бязьмежнаму—„Вечар", Красоўскаму—„Маладняк", „Мяне маці выпраўляла", „1907 г.", „Кавалерысты", „З вёскі", „Трэба вучыцца", За волю", „Эй мой конь", „Вясна". Стазвоннаму—„Запылала зоранька", Хвалі—„Новая Ладошкіну—„Балзёры хруст у сьнегавейных", Бядуліну—„Зімой розная", Ігнаценку—вясна пяе", ну—„Вежы ў жалезе," Бялько—шавіцкая вясна", Гаротнаму—„Пявянок",—азначаныя вершы друкавацца ня будуць. Асноўныя вывады мачэньні чытайце ў зьмешчаным ...тычным нарысе: Па каляінах часьці".

Паведамленьні.

Фрунзэўскі РК ЛКСМБ.—16-га мая а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні ФРК ЛКСМБ адбудзецца сэмінары акцыбрацкіх працаўнікоў.

17-га мая, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні ФРК ЛКСМБ адбудзецца паседжэньне конфліктнай камісіі РК. Выклікаюцца таварышы, якія маюць канфліктныя справы з ячэек: БДТ—2, Белдзяржкіно, Працасьветы, ЦСА і Комгас. На паседжаньне павінны зьявіцца сэкратары гэтых ячэек.

Дом Пісьменьніка. Сёньня, 15 мая а 7 гадзіне ў вечары, Менская філія БелАППа склікае сход пачынаючых пісьменьнікаў. На абвестцы дню—організацыя цэнтральнага літаратурнага рабочага гуртка.

Мен. АК ЛКСМБ. 16-га мая ... гадзіне ўвечары, ў памяшканьні ЛКСМБ склікаецца паседжаньне ...мовай камісіі. Яўка сяброў ... абавязкова Напаседжаньне выклікаюцца т. т. Гопман П. Я., Ліўшыц ... Багдановіч Х. Д., Маслакова Н. ... Шарамовіч А. Ю., Сарокіна ... Семашка В. К., Пенчанскі В. ... Мілько З. П., Аўрух А. Я., ... Ю. А., Чарвяўскі А. Н., ... Ф. І., Рывін Л. І., Фрыдлянд ... Казінік І. М., Гутэрман З. Я., ...блатт П. А. Шапіра Н. І., ...ва Т. Ф., Казінік І. Н. Муск... Бутрыс А. А., Міхайлаў А. А., ... А. А., Меншыкава Г. П. Пекор... Кабакова Г. Г. Іваноў Б. Ф., ...ка С. М.,

Кавалерыстыя!

16-га мая, а 6-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена" адбудзецца збор атраду „ЛК" пры „Ч. З."

Запрашаюцца т. т.; Чарняк, Казлоў, Голубеў А., Малашэнка (Энэргія), Новікаў, Барозна, Тарашэвіч (Будаўнікоў), Бабоўнікаў, Шандэровіч (Комунар). Наркіна (Швэйпром), а таксама жадаючыя працаваць у атрадзе „ЛК" пры газэце.

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА".

Адказны рэдактар—Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна Галоўлітбел № 599